Дысцыпліна: **“Сучасная беларуская мова” (спец. “Беларуская філалогія”, 3 курс ФФ)**

Лекцыя па тэме: **Прадмет і задачы сінтаксісу**

1. Прадмет і задачы сінтаксісу.
2. Сувязь сінтаксісу з іншымі раздзеламі мовазнаўства.
3. Асноўныя аспекты вывучэння сінтаксісу.

**1. Прадмет і задачы сінтаксісу.** Тэрмін **‘сінтаксіс’** двухзначны. Ён ужываецца для абазначэння аб’екта вывучэння і для абазначэння раздзела навукі аб мове. Сінтаксіс мовы як аб’ект вывучэння – гэта сінтаксічная арганізацыя, сукупнасць існуючых у мове заканамернасцей, якія рэгулююць пабудову сінтаксічных адзінак. Сінтаксіс як навука – гэта раздзел граматыкі, які вывучае пабудову і значэнне сінтаксічных адзінак. Увогуле ў перакладзе з грэчаскай мовы syntaxis азначае складанне, пабудова, пастаноўка ў пэўны парадак. Гэта раздзел граматыкі, які вывучае законы спалучэння слоў у словазлучэнні і сказы, будову сказаў і іх структурныя тыпы. Сінтаксіс з’яўляецца найвышэйшым узроўнем мовы, бо менавіта на гэтым узроўні ажыццяўляецца галоўная функцыя мовы – камунікатыўная, функцыя зносін.

Прадметам сінтаксісу з’яўляюцца словазлучэнні і сказы. У задачы сінтаксісу ўваходзіць наступнае:

1) апісанне тыпаў словазлучэнняў, сказаў, іх структурных частак;
2) высвятленне асаблівасцей іх выкарыстання ў мове;
3) вызначэнне спосабаў злучэння слоў, іх функцый і значэння ў сказе;
4) устанаўленне характару і відаў адносін паміж словамі ў словазлучэннях і сказах.

Асноўнымі сінтаксічнымі адзінкамі з’яўляюцца словазлучэнне, просты сказ, складаны сказ, складанае сінтаксічнае цэлае.

**2. Сувязь сінтаксісу з іншымі раздзеламі мовазнаўства.** Вядома, што мова ўяўляе сабой сістэму, г. зн. сукупнасць узаемазвязаных, узаемаабумоўленых элементаў. Гэта моўная сістэма складаецца з некалькіх падсістэм, або ўзроўняў (фаналагічны, марфалагічны, лексіка-семантычны і сінтаксічны ўзроўні).

1. Сінтаксіс звязаны з лексікалогіяй. Слова як лексічная адзінка з’яўляецца будаўнічым матэрыялам для словазлучэння і сказа. Пры пабудове сінтаксічных канструкцый выбар слоў абумоўлены неабходнасцю даць паведамленне пра факт і з’яву рэчаіснасці. Чым багацейшы слоўнікавы запас, тым паўней можна выразіць думку.

2. Марфалогія і сінтаксіс – дзве раўнапраўныя часткі граматыкі. Марфалогія вывучае слова і яго формы, правілы словазмянення і формаўтварэння, часціны мовы, іх класіфікацыю. Сінтаксічная роля слова ў сказе – адзін з крытэрыяў, які ўлічваецца пры падзеле часцін мовы на самастойныя і службовыя. Самастойныя словы маюць лексічнае значэнне, што складае аснову семантыкі сказа. Службовыя часціны мовы выяўляюць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

розныя сэнсавыя адносіны паміж прадметамі, дзеяннямі і г.д. Акрамя таго, неабходна памятаць, што назоўнік найчасцей ужываецца ў ролі дзейніка або дапаўнення, прыметнік – у ролі азначэння ці выказніка, дзеяслоў – у ролі выказніка і г.д.

3. Сувязь сінтаксісу з фанетыкай праяўляецца перш за ўсё праз інтанацыю. Ад інтанацыі залежыць расстаноўка знакаў прыпынку. Акрамя таго, даўно вядома, што ёсць сінтаксічныя канструкцыі, у якіх ад пастаноўкі знакаў прыпынку залежыць сэнс выказвання (Класічным прыкладам такой канструкцыі з'яўляецца вядомы рускі выраз *Казнить нельзя помиловать*.). Так, у сказе *Ведаеце, хацелася б, каб сабралі такіх людзей, якія трымаюць кароў, у адным месцы* ("Звязда", 2.09.11) апошняя коска ўплывае на сэнс усяго выказвання. Пры дыктаванні інтанацыя ў пэўнай меры паказвае на пунктуацыю, перадаючы сэнсава-сінтаксічнае чляненне тэксту (напрыклад, інтанацыя канца сказа, інтанацыя пры аднародных членах сказа).

**3. Асноўныя аспекты вывучэння сінтаксісу.**

1. Канструктыўны сінтаксіс. Яго аб'ектам з'яўляюцца сінтаксічныя адзінкі і іх кампаненты.
2. Камунікатыўны сінтаксіс. Яго аб'ектам служаць сінтаксічныя адзінкі, звязаныя з сітуацыяй мовы і абумоўленыя актуальным чляненнем выказвання.
3. Функцыянальны сінтаксіс. Яго аб'ектам з'яўляецца функцыя сінтаксічных адзінак і іх кампанентаў у арганізацыі звязнай мовы.
4. Семантычны сінтаксіс. Яго аб'ектам з'яўляюцца ўнутраныя заканамернасці фарміравання паведамлення, змешчанага ў сінтаксічных адзінках.
5. Стылістычны сінтаксіс. Яго аб'ектам з'яўляюцца патэнцыяльныя магчымасці выкарыстання сінтаксічных адзінак у тэксце.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ